

# Ружанец перапрашэння
# Беззаганнага Сэрца Марыі
# з разважаннямі паводле
# святой сястры Фаўстыны Кавальскай

## з нагоды малітоўнай падрыхтоўкі да прысвячэння
## Божай Міласэрнасці і Беззаганнаму Сэрцу Марыі
## Мінска-Магілёўскай мітраполіі
## ў 2025-м – Юбілейным годзе хрысціянства

# Ружанец перапрашэння Беззаганнага Сэрца Марыі з разважаннямі паводле святой сястры Фаўстыны Кавальскай

NIHIL OBSTAT
Цэнзар кс. кан. д-р Ян Крэміс
Мінск, 13 верасня 2024 г.
IMPRIMATUR
+ Арцыбіскуп Юзаф Станеўскі
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі
Старшыня Канферэнцыі Біскупаў
Мінск, № 189/к/24 ад 14 верасня 2024 г.

*Фрагменты Святога Евангелля ў разважаннях пададзены паводле выдання: «Новы Запавет» (Мінск: Про Хрысто, 2017), падрыхтаванага Секцыяй па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры ККББ. Разважанні падрыхтаваныя паводле выдання: «Różaniec ze świętą Siostrą Faustyną» (Częstochowa, 2004; wybór tekstów: s. M. Elżbieta Siepak ZMBM). Далей па тэксце ў дужках падаюцца нумары адпаведных фрагментаў з «Дзённіка», якія цытуюцца паводле выдання: святая сястра Фаўстына Кавальская ZMBM. «Дзённік: Божая Міласэрнасць у маёй душы» (Мінск: Про Хрысто, 2014; пер. з пол. Крыстыны Лялько). Тэкст перапрашэння Беззаганнага Сэрца Марыі, змешчаны пасля разважання кожнай таямніцы, пададзены паводле выдання: «Дзеля трыўмфу Беззаганнага Сэрца Марыі. Набажэнствы ў першыя суботы месяца» (Мінск: Про Хрысто, 2023).*

## Парадак малітвы:

1. Малітва перад Ружанцам.
2. Выбраная частка Ружанца.
3. Малітва на заканчэнне Ружанца.
4. Малітва прысвячэння Маці Божай.
5. Літанія да Найсвяцейшай Панны Марыі.
6. Разважанне (медытацыя) над таямніцай Ружанца.

## Малітва перад Ружанцам

*Молімся:* О Марыя, праз набажэнствы першых суботаў месяца прагнем перапрасіць за пяць відаў знявагаў і абразаў Твайго Беззаганнага Сэрца. Прымі гэтае наша перапрашэнне за блюзнерствы, скіраваныя супраць Твайго Беззаганнага Зачацця, Твайго Дзявоцтва і Твайго Божага Мацярынства. Ахвяруючы Табе гэтае наша перапрашэнне, просім прабачэння для тых, хто не прызнае Цябе за Маці ўсяго чалавецтва і хто сее ў сэрцах дзяцей абыякавасць, ігнараванне і нават нянавісць да Цябе. Урэшце прагнем перапрасіць за знявагі, прычыненыя Табе тымі, хто зневажае Твае святыя выявы.

Маці Божая, аддаем Табе нашыя сэрцы. Ачысці іх, распалі ў іх любоў. Выпрасі нам святло Духа Святога, каб мы маглі пазнаць волю Божую і выканаць яе з Тваёй дапамогаю.

Жадаючы суцешыць і перапрасіць Тваё Беззаганнае Сэрца, распачынаем малітву Святога Ружанца.

## Малітва на заканчэнне Ружанца

Каралева Ружанца Святога, наша Фацімская Пані! Дзякуем Табе за дапамогу, якую Ты нам аказала. Тваё Фацімскае пасланне — гэта праява Мацярынскай любові. Ты прагнеш усіх уратаваць і кожнага хочаш правесці на Неба.

Хвала і праслаўленне Айцу і Сыну, і Духу Святому за гэтую поўную велічы Каралеву Неба, за Яе Фацімскае пасланне і за выслухоўванне нашых просьбаў. Амэн.

## Малітва прысвячэння Маці Божай

*(чытаецца пасля Ружанца)*

Благаслаўлёная Ты, Марыя, пасланая Богам у Фаціму. Ты прынесла свету пасланне надзеі, заклік да малітвы і пакаяння, а таксама просьбу аб кампенсацыі за грахі, якія чыняць сучасныя людзі.

У той час, калі паволі набліжаецца спаўненне Тваіх словаў аб трыўмфе Твайго Беззаганнага Сэрца, мы звяртаемся да Цябе ў духу любові, пакоры і бязмежнага даверу і, яднаючыся з усім Касцёлам, усклікаем да Цябе: «Тваёй абароне аддаёмся, Святая Багародзіца!».

Сёння стаім перад Табою, наша Маці, Маці нашых сем'яў, Маці людзей і ўсіх народаў. Ты ведаеш усе нашыя цярпенні і надзеі, Ты па-мацярынску адчуваеш усе змаганні паміж дабром і злом, паміж святлом і цемрай, якія ўскалыхваюць наш сучасны свет. Просім, прымі нашыя малітвы, скіраваныя ў Найсвяцейшым Духу да Твайго Сэрца, і атулі Мацярынскай любоўю наш чалавечы свет, які мы даручаем Табе, непакоячыся за зямны і вечны лёс нас саміх і ўсіх нашых братоў і сясцёр.

Ты казала са смуткам: «Шмат душаў ідзе на асуджэнне». Сваёй духоўнай дачцэ, Люцыі, Ты тлумачыла, што «сучасны свет заслугоўвае патопу больш, чым у часы Ноя», а ў сваёй фацімскай таямніцы пакінула нам папярэджанне: сёння свет заслужыў вялікую Божую кару. Толькі Бог можа змяніць ход нашай гісторыі, пакласці канец распаўсюджванню вакол нас цывілізацыі смерці, абудзіць у людзей прагненне будаваць новы, лепшы свет. Як вучні Хрыста, пакліканыя да Яго служэння, стоячы сёння перад Табою, мы прагнем разам з усім Касцёлам з'яднацца перад Тваім Беззаганным Сэрцам у прысвячэнні, з якім Твой Сын у любові да нас аддаў сябе Айцу: «І за іх Я прысвячаю сябе, каб і яны былі асвячоныя ў праўдзе» (Ян 17, 19). Прагнем з'яднацца з нашым Адкупіцелем у гэтым прысвячэнні за свет і за чалавецтва — прысвячэнні, якое ў Яго Боскім Сэрцы мае моц перапрашэння і кампенсацыі за грахі.

Сёння аддаемся Табе безаглядна, каб кожны з нас быў «цалкам Твой», ажно на вякі, каб нішто не адлучыла нас ад Езуса, Збаўцы свету. Няхай нашае прысвячэнне ў еднасці з прысвячэннем Твайго Сына мае моц перамяніць навакольны свет. Няхай яно агорне ўсіх людзей і дапаможа перамагчы ўсялякае зло, якое дух цемры здольны пасяліць у сэрцы чалавека і ў яго ўчынках — тое, якое ўжо распаліў у наш час.

Просім Цябе, Марыя! Пакажы нам сваё Беззаганнае Сэрца — шлях, які вядзе сучасны свет да Бога. Просім, «ад усялякай злой прыгоды выбаўляй нас заўсёды!».

Дапамажы нам моцаю Духа Святога перамагаць усялякі грэх, грэх у кожным яго абліччы: у нас саміх і вакол нас.

Няхай наш дзіцячы давер будзе Тваёю прыладаю, якую Ты выкарыстаеш згодна з Божаю воляю, каб настала цывілізацыя любові, згоды і святасці жыцця — у нас, нашых сем’ях і ўсіх народах.

Няхай у гісторыі свету яшчэ раз аб’явіцца бязмежная магутнасць Адкуплення — магутнасць міласэрнай Любові! Няхай яна спыніць зло! Няхай пераменіць сумленні людзей! Няхай у Тваім Беззаганным Сэрцы для ўсіх адкрыецца святло надзеі!

Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі. Амэн.

## Літанія да Найсвяцейшай Панны Марыі

*(Ларэтанская)*

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон,*
Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас.*
Ойча з неба, Божа, *– змілуйся над намі.*
Сыне, Адкупіцель свету, Божа,
Духу Святы, Божа,
Святая Тройца, адзіны Божа, *– змілуйся над намі.*

Святая Марыя, *– маліся за нас.*
Святая Багародзіца,
Святая Панна над паннамі,
Маці Хрыстова,
Маці Касцёла,
Маці ласкі Божай,
Маці міласэрнасці,
Маці надзеі,
Маці прачыстая,
Маці беззаганная,
Маці непарушная,
Маці нявінная,
Маці наймілейшая,
Маці найцудоўнейшая,
Маці добрай рады,
Маці Стварыцеля,
Маці Збавіцеля,
Панна наймудрэйшая,
Панна, хвалы годная,
Панна праслаўлёная,
Панна магутная,
Панна ласкавая,
Панна верная,

Люстра справядлівасці,
Сталіца мудрасці,
Прычына нашай радасці,
Святыня духоўная,
Святыня хвалебная,
Святыня слаўная пабожнасці,
Ружа містычная,
Вежа Давідава,
Вежа з косці слановай,
Залаты доме,
Каўчэг Запавету,
Брама нябесная,
Зорка ранішняя,
Аздараўленне хворых,
Прытулак грэшных,
Палёгка мігрантаў,
Суцяшальніца засмучаных,
Успамога хрысціянаў,
Каралева анёлаў,
Каралева патрыярхаў,
Каралева прарокаў,
Каралева Апосталаў,
Каралева мучанікаў,
Каралева веравызнаўцаў,
Каралева паннаў,
Каралева ўсіх святых,
Каралева, без граху першароднага зачатая,
Каралева ўнебаўзятая,
Каралева Ружанца святога,
Каралева сем’яў,
Каралева супакою,
Каралева Беларусі, – *маліся за нас*.

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *даруй нам, Пане.*
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *выслухай нас, Пане*.
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *змілуйся над намі*.

С.: Маліся за нас, Святая Багародзіца.

Н.: Каб сталіся мы годнымі абяцанняў Хрыстовых.

*Молімся:* Просім Цябе, Пане Божа, дазволь нам, слугам Тваім, цешыцца трывалым здароўем душы і цела, і праз слаўнае заступніцтва Найсвяцейшай заўсёды Панны Марыі май ласку вызваліць нас ад цяперашняга смутку і адарыць вечнай радасцю. Праз Хрыста, Пана нашага.

Н.: Амэн.

## Тваёй абароне

Тваёй абароне аддаёмся, Святая Багародзіца, у нашых патрэбах не пагарджай маленнем нашым. І ад усялякай злой прыгоды выбаўляй нас заўсёды, Панна хвалебная і благаслаўлёная.

О Пані наша, Апякунка наша, Суцяшальніца наша, Ты Заступніца наша, з Сынам сваім нас паяднай, Сыну свайму нас даручай, Сыну свайму нас аддавай.

## Малітва св. Бэрнарда

Памятай, о Найсвяцейшая Панна Марыя, што ніколі не здаралася, каб пакінула таго, хто да Цябе ўцякае, Цябе на дапамогу кліча, Тваёй апекі просіць. Гэтым даверам натхнёны, да Цябе, о Панна над паннамі і Маці наша, імкнуся, да Цябе прыходжу, перад Табою, грэшны, плачучы, стаю. О Маці Слова, не пагарджай словамі маімі, але пачуй іх ласкава і выслухай. Амэн.

## Разважанне (медытацыя) над таямніцай Ружанца

*(на выбар, 15 хвілін)*

### Малітва перад медытацыяй

Маці Найсвяцейшая, Беззаганная Марыя! У першыя суботы месца Ты адкрываеш сваё Беззаганнае Сэрца для ўсіх, хто прагне прыняць у сваё сэрца гэтыя найважнейшыя знакі, якія Бог паказаў нам у Фаціме. Прашу, адкрый перад намі сваё Сэрца. Асмельваемся прасіць аб гэтым з цалкавітай пакорай, а таксама з дзіцячаю адвагаю, таму што хочам наследаваць Цябе у вернасці Богу, таму што хочам жыць любоўю да Твайго Сына, таму што прагнем заўсёды трываць у стане ласкі, і нарэшце, таму, што прагнем ўсё, што толькі можам, ахвяраваць у духу ўміласціўлення за грахі тых людзей, якія зневажаюць і абражаюць Цябе. Дапамажы, каб сэрцы нашыя станавіліся ўсё больш любымі Табе, больш блізкімі Табе, больш падобнымі да Твайго Беззаганнага Сэрца. Амэн.

(*Прыклад медытацый змешчаны ў выданні: «Дзеля трыўмфу Беззаганнага Сэрца Марыі. Набажэнствы ў першыя суботы месяца» (Мінск: Про Хрысто, 2023) і на сайце ave-maria.by*).

# Святы Ружанец

**Веру ў Бога,** Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі, і ў Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага, які быў зачаты ад Духа Святога, нарадзіўся з Дзевы Марыі, замучаны пры Понцкім Пілаце, укрыжаваны, памёр і быў пахаваны; зышоў да адхлані, на трэці дзень уваскрос з памерлых, узышоў на неба, сядзіць праваруч Бога Айца ўсемагутнага, адтуль прыйдзе судзіць жывых і памерлых. Веру ў Духа Святога, святы Касцёл каталіцкі, еднасць святых, адпушчэнне грахоў, уваскрашэнне цела, жыццё вечнае. Амэн.

**Ойча наш,** каторы ёсць у небе, свяціся імя Тваё, прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння і адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым, і не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Амэн.

**Вітай, Марыя,** поўная ласкі, Пан з Табою, благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго, Езус. Святая Марыя, Маці Божая, маліся за нас, грэшных, цяпер і ў хвіліну смерці нашай. Амэн. *(3 разы)*

**Хвала Айцу** і Сыну, і Духу Святому. Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амэн.

## Радасныя таямніцы

«...Я ўбачыла Маці Божую паміж небам і зямлёю, у светлым адзенні, Яна малілася са складзенымі на грудзях рукамі, углядваючыся ў неба, а з Яе Сэрца сыходзілі агністыя прамяні — адны ішлі ў неба, а другія пакрывалі нашую зямлю.

О Панна Прамяністая, чыстая, як крышталь, цалкам заглыбленая ў Бога, я аддаю Табе маё ўнутранае жыццё, кіруй усім так, каб гэта было прыемна Твайму Сыну» («Дзённік», 33, 844).

### I. Звеставанне Найсвяцейшай Панне Марыі

«І сказаў Ёй анёл: „Не бойся, Марыя, бо знайшла Ты ласку ў Пана. Вось зачнеш ва ўлонні сваім і народзіш Сына, і дасі Яму імя Езус. Ён будзе вялікі і будзе названы Сынам Найвышэйшага“. <...> Тады Марыя сказала: „Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова“» (Лк 1, 30–32, 38).

«Найвялікшую любоў і бездань міласэрнасці мы спазнаем ва Уцелаўленні Слова. <...> Сёння я адчула блізкасць сваёй Маці — нябеснай Маці, хоць перад кожнаю святою Камуніяй я горача прашу Маці Божую, каб Яна дапамагла мне падрыхтаваць душу да прыйсця свайго Сына, і ясна адчуваю над сабою Яе апеку. Я вельмі прашу Яе, каб Яна пажадала распаліць ува мне агонь Божай любові, якою палала Яе чыстае Сэрца ў момант Уцелаўлення Слова Божага» («Дзённік», 180, 1114).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп веры і паслухмянасці многіх людзей, якія не хочуць слухаць Бога і Яму служыць.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш..., Вітай, Марыя... (10 разоў), Хвала Айцу...*

Паўтараем пасля кожнай таямніцы:

*Няхай будзе праслаўлёны Найсвяцейшы Сакрамэнт, праўдзівае Цела і Кроў Пана нашага Езуса Хрыста.*

*О мой Езу, прабач нам грахі нашыя, захавай нас ад агню пякельнага, правядзі ўсе душы на неба і дапамажы асабліва тым, каму найбольш патрэбна Твая міласэрнасць.*

*О Марыя, без граху першароднага зачатая, маліся за нас, хто ў Цябе паратунку шукае, і за тых грэшных, хто Табою пагарджае, асабліва за ворагаў Касцёла і даручаных Табе.*

*Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі.*

## II. Адведзіны Паннай Марыяй святой Альжбеты

«Сабраўшыся, Марыя ў тыя дні паспяшыла ў горную краіну, у горад Юды. Яна ўвайшла ў дом Захарыі і прывітала Альжбету. <...> Прабыла Марыя ў Альжбеты каля трох месяцаў і вярнулася ў свой дом» (Лк 1, 39–40.56).

«[Езус сказаў]: Дачка Мая, падчас гэтай медытацыі разважай над любоўю да бліжняга: ці кіруе тваёю любоўю да бліжніх Мая любоў, ці молішся ты за ворагаў? Ці жадаеш ты дабра тым, хто цябе якімсьці чынам засмуціў або абразіў? Ведай, што ўсё дабро, якое ты ўчыніш якой-небудзь душы, Я прыму так, быццам ты ўчыніла гэта Мне» («Дзённік», 1768).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за тое, што так шмат людзей не прызнае Яе заступніцтва перад Богам і не шукае ў Яе дапамогі і апекі.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

## III. Нараджэнне Езуса Хрыста

«...Надышоў Ёй час нарадзіць. І нарадзіла Сына свайго першароднага. Спавіла Яго і паклала ў яслі, бо не было ім месца ў заездзе» (Лк 2, 6–7).

«Прыйшоўшы на Пастэрку, тут жа на пачатку святой Імшы я пагрузілася ў глыбокую засяроджанасць, у якой бачыла бэтлеемскую стаенку, залітую вялікім святлом. Найсвяцейшая Панна, напоўненая вялікаю любоўю, спавівала Езуса, а св. Юзаф яшчэ спаў. Толькі калі Божая Маці паклала Езуса ў яслі, тады святло Божае абудзіла Юзафа, які таксама пачаў маліцца. Аднак праз хвіліну я засталася сам-насам з малым Езусам, які працягваў да мяне свае ручаняты, і я здагадалася ўзяць Яго да сябе на рукі. Езус прытуліў сваю галоўку да майго сэрца і сваім глыбокім паглядам даў мне зразумець, што Яму добра каля майго сэрца» («Дзённік», 1442).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп веры многіх людзей у Божае Мацярынства і вечнае Дзявоцтва Хрыстовай Маці. Перапрашаем Яе за іх пыху і няўменне пакарыцца таямніцы Нованароджанага.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

## IV. Ахвяраванне Хрыста ў святыні

«...І благаславіў іх Сімяон, і сказаў Марыі, Маці Яго: „Вось гэты прызначаны на падзенне і на паўстанне многіх у Ізраэлі і на знак, якому супраціўляцца будуць. А праз Тваю душу пройдзе меч, каб выявіліся думкі многіх сэрцаў“» (Лк 2, 34–35).

«О Марыя, сёння страшны меч прабіў Тваю святую душу, але апрача Бога ніхто не ведае пра Тваё цярпенне. Твая душа не надламаная, яна мужная, бо прабывае з Езусам. Маці наймілейшая, злучы маю душу з Езусам, бо толькі тады я вытрываю ўсе выпрабаванні і цяжкасці, і толькі ў лучнасці з Езусам мае ахвяркі будуць прыемныя Богу.

Маці наймілейшая, вучы мяне ўнутранаму жыццю, няхай меч цярпенняў ніколі мяне не разаб'е. О чыстая Дзева, улі ў маё сэрца мужнасць і сцеражы яго» («Дзённік», 915).

У гэтай таямніцы перапрашайма Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп у сучасным свеце духу адрачэння і ахвяры.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

## V. Езуса знаходзяць у Ерузалемскай святыні

«Бацькі Езуса хадзілі штогод у Ерузалем на свята Пасхі. <...> Калі па заканчэнні дзён свята вярталіся, застаўся Хлопец Езус у Ерузалеме, і не заўважылі гэтага Ягоныя бацькі. <...> Пасля трох дзён знайшлі Яго ў святыні. Ён сядзеў сярод настаўнікаў, слухаючы іх і пытаючыся ў іх» (Лк 2, 41–46).

«Я не шукаю шчасця па-за душою, у якой прабывае Бог. Я радуюся ва ўласнай душы. Тут я пастаянна з Ім прабываю, тут мая найбольш цесная сувязь з Ім, тут я з Ім знаходжуся ў бяспецы, сюды не пранікае людскі позірк. Найсвяцейшая Панна заахвочвае мяне да такіх зносінаў з Богам» («Дзённік», 454).

«Езу, Крыніца жыцця, асвячай мяне. Моц мая, умацоўвай мяне. Правадыр мой, змагайся за мяне. Адзінае Святло маёй душы, асвячай мяне. Настаўнік мой, вядзі мяне, я разлічваю на Цябе, як немаўля — на любоў сваёй маці. Калі ўсё паўстане супраць мяне і нават калі зямля пахіснецца пад маімі нагамі, я буду спакойная каля Твайго Сэрца» («Дзённік», 1490).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за непаслухмянасць Яе Сыну і пагарджанне Яго вучэннем многімі людзьмі. Перапрашаем за тое, што сучасны свет апанавала секулярызацыя і ў штодзённым жыцці няма месца для Бога.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.*

## Таямніцы святла

«О спрадвечнае Святло, што прыходзіш на гэтую зямлю, прасвятляй мой розум і ўмацоўвай маю волю, каб я не стамілася ў хвіліны цяжкіх выпрабаванняў. Няхай Тваё святло рассее ўсялякі цень сумнення, няхай Твая ўсемагутнасць дзейнічае праз мяне. Давяраю Табе, о Святло нястворанае» («Дзённік», 830).

### I. Хрост Езуса ў Ярдане

«Калі хрысціўся ўвесь народ і калі Езус, прыняўшы хрост, маліўся, раскрылася неба, і Дух Святы ў цялесным выглядзе, як голуб, сышоў на Яго, і быў голас з неба: „Ты Сын Мой умілаваны, Цябе ўпадабаў Я“» (Лк 3, 21–22).

«Аднаго разу пасля святой Камуніі я пачула гэтыя словы: ***Ты — жытло для Нас.*** У той момант я адчула ў душы прысутнасць Святой Тройцы — Айца, Сына і Духа Святога, я адчувала сябе святыняю Божаю, адчувала, што я — дзіця Айца. Я не магу ўсяго растлумачыць, але душа гэта добра разумее. О бясконцая Дабрыня, як моцна Ты прыніжаешся да мізэрнага стварэння» («Дзённік», 451).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп веры і паслухмянасці многіх людзей, якія не хочуць слухаць Бога і Яму служыць.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

Паўтараем пасля кожнай таямніцы:

*Няхай будзе праслаўлёны Найсвяцейшы Сакрамэнт, праўдзівае Цела і Кроў Пана нашага Езуса Хрыста.*

*О мой Езу, прабач нам грахі нашыя, захавай нас ад агню пякельнага, правядзі ўсе душы на неба і дапамажы асабліва тым, каму найбольш патрэбна Твая міласэрнасць.*

*О Марыя, без граху першароднага зачатая, маліся за нас, хто ў Цябе паратунку шукае, і за тых грэшных, хто Табою пагарджае, асабліва за ворагаў Касцёла і даручаных Табе.*

*Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі.*

## II. Езус аб'яўляе сябе на вяселлі ў Кане

«Маці Яго сказала слугам: „Тое, што Ён скажа вам, зрабіце“» (Ян 2, 5).

«...Я засталася адна з Найсвяцейшаю Маці, якая навучала мяне наконт Божай волі, як ёю карыстацца ў жыцці, цалкам падпарадкоўваючыся Яго найсвяцейшым прысудам. Немагчыма падабацца Богу, не выконваючы Яго святой волі. «Дачка Мая, Я настойліва рэкамендую табе верна выконваць усе Божыя пажаданні, бо гэта найбольш прыемнае Яго святым вачам. Я вельмі хачу, каб ты ў гэтым вызначылася, гэта значыць у вернасці выканання волі Бога. Гэтую волю Бога пастаў па-над усімі ахвярамі і ўсеспаленнямі». Калі Маці Божая казала мне гэта, у маю душу ўваходзіла глыбокае зразуменне волі Бога» («Дзённік», 1244).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за тое, што так шмат людзей не прызнае Яе заступніцтва перад Богам і не шукае ў Яе дапамогі і апекі.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

## III. Абвяшчэнне Божага Валадарства і заклік да навяртання

«...Ён праходзіў па гарадах і паселішчах, прапаведуючы і абвяшчаючы Добрую Навіну пра Валадарства Божае» (Лк 8, 1).

«Пан сказаў мне: ***Дачка Мая, не спыняйся ў абвяшчэнні Маёй міласэрнасці***. <...> О Любоў Адвечная, я прагну, каб Цябе спазналі ўсе душы, якія Ты стварыў.

Я хацела б стаць святаром, каб пастаянна гаварыць пра Тваю міласэрнасць грэшным душам, пагружаным у роспач. Я жадала б стаць місіянерам і несці святло веры ў варварскія краіны, каб даць душам спазнаць Цябе, каб, ахвяруючы сябе за іх, памерці мучаніцкаю смерцю, якою Ты памёр за мяне і за іх. О Езу, я ведаю вельмі добра, што магу быць святаром, місіянерам, прапаведнікам, магу памерці мучаніцкаю смерцю праз поўнае самазнішчэнне і самаадрачэнне з любові да Цябе, Езу, і да несмяротных душаў» («Дзённік», 1521, 302).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія не думаюць пра вечнасць і не клапоцяцца пра чысціню сваёй душы і свайго сумлення.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

## IV. Перамяненне Езуса на гары Табор

«Праз шэсць дзён узяў Езус Пятра, Якуба і Яна, брата ягонага, і павёў іх адных на высокую гару, і перамяніўся перад імі. Аблічча Ягонае заззяла, як сонца, і адзенне Ягонае стала белае, як святло» (Мц 17, 1–2).

«Езу мой, прасякні ўсю мяне, каб я магла адлюстраваць Цябе ўсім сваім жыццём. Абагаві мяне, каб мае ўчынкі мелі звышнатуральную каштоўнасць. Учыні так, каб да кожнай душы, без выключэння, ува мне была любоў, літасць і міласэрнасць. <...> Я прагну ўся перамяніцца ў Тваю міласэрнасць і быць жывым адлюстраваннем Цябе, о Пане; няхай гэта найвялікшая ўласцівасць Бога — Яго неспасцігальная міласэрнасць — пройдзе праз сэрца і душу маю да бліжніх. <...> О Езу мой, перамяні мяне ў Сябе, бо Ты ўсё можаш» («Дзённік», 1242, 163).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп у сучасным свеце духу адрачэння і ахвяры.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

## V. Устанаўленне Эўхарыстыі

«Я — хлеб жывы, які сышоў з неба. Калі хто будзе спажываць гэты хлеб, будзе жыць вечна» (Ян 6, 51).

«Самая ўрачыстая хвіліна ў маім жыцці — гэта хвіліна, калі я прымаю святую Камунію. <...> Калі Ён увайшоў у святліцу майго сэрца, мая душа пранікласся такою вялікаю пашанаю, што са страху самлела, падаючы да Яго ног. Езус падаў ёй сваю руку і ласкава дазволіў сесці каля сябе. Супакойваў яе: ***Бачыш, Я пакінуў нябесны трон, каб з’яднацца з табою. Тое, што ты бачыш, — гэта ўсяго толькі частачка, а твая душа ўжо млее ад любові, але як жа будзе ўражана тваё сэрца, калі ты ўбачыш Мяне ва ўсёй хвале! Але Я хачу табе сказаць, што гэтае вечнае жыццё павінна пачацца ўжо тут, на зямлі, праз святую Камунію. Кожная святая Камунія робіць цябе больш здольнаю да зносінаў з Богам на працягу усёй вечнасці***» («Дзённік», 1804, 1810).

«Марыя, Маці мая і Пані мая, я аддаю Табе маю душу і цела, маё жыццё і смерць, і тое, што пасля яе настане. Усё аддаю ў Твае рукі, о Маці мая, ахіні маю душу сваім дзявочым покрывам і ўдзялі мне ласку чысціні сэрца, душы і цела, і барані мяне сваёю моцаю ад усіх непрыяцеляў...» («Дзённік», 79).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за нягоднае прыняцце святой Камуніі і за ўсялякую абыякавасць у адносінах да Езуса, прысутнага ў Найсвяцейшым Сакрамэнце.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.*

## Балесныя таямніцы

«Езус мне сказаў, што больш за ўсё я Яму падабаюся, калі разважаю над Яго балеснаю Мукаю, і праз гэтае разважанне на маю душу сыходзіць шмат святла. Хто хоча навучыцца сапраўднай пакоры, няхай разважае над мукаю Езуса. <...> Я хачу быць падобнаю да Цябе, Езу, да Цябе ўкрыжаванага, замучанага, прыніжанага. Езу, захавай у маёй душы і сэрцы сваю пакору. Я люблю Цябе, Езу, да шаленства. Цябе, вымучанага, такога, пра якога сведчыць прарок, як бы ён не мог убачыць у Табе чалавечага аблічча з-за Тваіх вялікіх цярпенняў. У такім стане я люблю Цябе, Езу, да шаленства. Божа спрадвечны і бязмерны, што ўчыніла з Табою любоў?..» («Дзённік», 267).

### I. Малітва Езуса ў садзе Аліўным

«А сам адышоў ад іх, як кінуць камень, укленчыў і маліўся, кажучы: „Ойча, калі Ты жадаеш, адхілі ад Мяне гэты келіх. Але не Мая воля, а Твая няхай станецца“. <...> І, моцна пакутуючы, Ён маліўся яшчэ больш. А пот Ягоны быў, быццам кроплі крыві, што падалі на зямлю» (Лк 22, 41–44).

«Вечарам, увайшоўшы ў малую каплічку, я пачула ў душы такія словы: ***Дачка Мая, разважай над гэтымі словамі: „І, моцна пакутуючы, Ён маліўся яшчэ больш“***. Калі я пачала глыбей задумвацца, шмат святла вылілася на маю душу. Я зразумела, наколькі неабходна нам трываласць у малітве і што ад такой нялёгкай малітвы часта залежыць нашае збаўленне» («Дзённік», 157).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за ўсе грахі і блюзнерствы, якія сталі прычынаю агоніі Хрыста.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

Паўтараем пасля кожнай таямніцы:

*Няхай будзе праслаўлёны Найсвяцейшы Сакрамэнт, праўдзівае Цела і Кроў Пана нашага Езуса Хрыста.*

*О мой Езу, прабач нам грахі нашыя, захавай нас ад агню пякельнага, правядзі ўсе душы на неба і дапамажы асабліва тым, каму найбольш патрэбна Твая міласэрнасць.*

*О Марыя, без граху першароднага зачатая, маліся за нас, хто ў Цябе паратунку шукае, і за тых грэшных, хто Табою пагарджае, асабліва за ворагаў Касцёла і даручаных Табе.*

*Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі.*

## II. Бічаванне Езуса

«Пілат <...> зноў выйшаў да юдэяў і сказаў ім: „Я не знаходжу ў Ім ніякай віны. <...> Калі хочаце, я адпушчу вам караля юдэйскага?“ Тады яны зноў закрычалі: „Не Яго, але Барабу!“ <...> Тады Пілат узяў Езуса і аддаў на бічаванне» (Ян 18, 38–40; 19, 1).

«...Я ўбачыла Пана Езуса — як Ён цярпеў бічаванне. О гэтыя неспасцігальныя мучэнні! Як страшна Езус цярпеў пры бічаванні. О бедныя грэшнікі, як вы сустрэнецеся ў Судны дзень з гэтым Езусам, якога цяпер так катуеце? Яго Кроў сплывала на зямлю, а ў некаторых месцах Цела пачало адпадаць. І я бачыла на плячах Яго пару касцей, якія агаліліся з цела... Ціхі Езус выдаваў стогн і ўздыханне» («Дзённік», 188).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп аскезы, а таксама за распусту і пакланенне целу, так распаўсюджаныя ў сучасным свеце.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

## III. Укаранаванне Езуса цернем

«І сплёўшы вянок з церняў, усклалі Яму на галаву і далі Яму ў правую руку трысціну. Становячыся перад Ім на калені, насміхаліся з Яго, кажучы: „Вітай, кароль Юдэйскі!“ І плявалі на Яго, бралі трысціну і білі Яго па галаве» (Мц 27, 29–30).

«...Пасля бічавання ка́ты ўзялі Пана і знялі з Яго шату, якая ўжо прыліпла да Ранаў; пры зняцці зноў адкрыліся Яго Раны. Тады яны накінулі на Пана чырвоны плашч, брудны і абшарпаны — на свежыя раны. Гэты плашч толькі ў некаторых месцах ледзьве дастаўаў да каленяў. І загадалі Пану сесці на кавалак бэлькі; тады сплялі карону з церняў і адзелі на святую галаву, і далі Яму ў рукі трысціну. І насміхаліся з Яго, аддаючы Яму паклоны, як каралю, плявалі Яму ў твар, а іншыя бралі трысціну і білі Яго па галаве, іншыя кулакамі прычынялі Яму боль, а іншыя закрылі Яму твар і білі Яго кулакамі. Ціха цярпеў гэта Езус. Хто зразумее Яго — Ягонае цярпенне? Позірк Езуса быў скіраваны на зямлю; я адчула, што тады адбывалася ў наймілейшым Сэрцы Езуса. Няхай кожная душа разважае над тым, што Езус цярпеў у той момант, калі наперабой зневажалі Пана. Я думала, адкуль такая злосць у чалавеку, і ўсё ж гэта ўчыняе грэх — тут сустрэліся Любоў і грэх» («Дзённік», 408).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі, якія вынікаюць са крывадушнасці людскіх сэрцаў, што кіруюцца зайздрасцю, хцівасцю ці страхам.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

## IV. Езус нясе крыж на гару Кальварыйскую

«А калі насмяяліся з Яго, знялі з Яго плашч і апранулі ў Ягоную вопратку, і павялі на ўкрыжаванне. Выходзячы, яны сустрэлі аднаго кірэнэйца па імені Сымон, якога прымусілі несці Ягоны крыж» (Мц 27, 31–32).

«Яшчэ не ўсё ведае свет пра тое, што выцерпеў Езус. Я суправаджала Яго ў Аліўным садзе і ў цямніцы, на судовых допытах, я была з Ім падчас кожнага Яго мучэння. Па-за маёю ўвагаю не застаўся ніводзін Яго рух, ніводзін Яго позірк, я спазнала поўную ўсемагутнасць Яго любові і міласэрнасць да душаў» («Дз», 1054).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія адкідваюць крыж і ў сваім штодзённым жыцці адносяцца да бліжніх з абыякавасцю ці нават нянавісцю.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

## V. Укрыжаванне і смерць Езуса

«Калі прыйшлі на месца, званае Чэрап, укрыжавалі там Яго і злачынцаў, аднаго з правага, другога з левага боку. А Езус сказаў: „Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць“. <...> Было ўжо каля шостай гадзіны, і цемра настала па ўсёй зямлі аж да гадзіны дзявятай. <...> А Езус закрычаў моцным голасам: „Ойча, у рукі Твае аддаю дух Мой“. І, сказаўшы гэта, сканаў» (Лк 23, 33–34.44.46).

«А трэцяй гадзіне я ўбачыла ўкрыжаванага Пана Езуса, які зірнуў на мяне і прамовіў: ***Прагну.*** У гэты момант я ўбачыла, як з Яго боку выйшлі тыя самыя два прамяні, такія ж, як на гэтым абразе. Раптам я адчула ў душы прагу збаўлення душаў і самаахвяравання за бедных грэшнікаў. <...> Езус ужо завяршыў сваё смяротнае жыццё, я чула Яго сем словаў, пасля Ён зірнуў на мяне і сказаў: ***Любая дачка Майго сэрца, ты для Мяне — прахалода сярод страшных мукаў***» («Дз», 648; 1058).

«Маці Божая, Твая душа была пагружана ў мора горычы, узглянь на сваё дзіця і навучы цярпець і любіць у цярпенні. Умацуй маю душу, каб боль яе не зламаў. Маці ласкі, навучы мяне жыць з Богам» («Дз», 315).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія пазбягаюць цярпенняў і крыжа, а шукаюць толькі выгады і задавальнення, адкідваюць дух аскезы, ахвяры і пакаяння.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.*

## Хвалебныя таямніцы

«О Маці, Беззаганная Панна,
У Табе я бачу промень Бога.
Ты мяне вучыш, як сярод бураў любіць Пана,
Ты — апора мая і абарона ад ворага».
(«Дзённік», 1232)

### I. Уваскрасенне Хрыста

«Анёл жа, прамаўляючы да жанчын, сказаў: „Не бойцеся! Ведаю, што вы шукаеце Езуса ўкрыжаванага. Яго тут няма, Ён уваскрос, як сказаў. Падыдзіце, пабачце месца, дзе быў пакладзены...“ <...> А Езус, выйшаўшы ім насустрач, сказаў: „Вітайце“. <...> Нарэшце, з’явіўся Адзінаццаці, калі яны сядзелі за сталом, і папракаў іх за бязвер’е і жорсткасць сэрца, бо не паверылі тым, хто бачыў Яго ўваскрослага» (Мц 28, 5–6.9; Мк 16, 14).

«Сёння ў часе рэзурэкцыі я ўбачыла [ў] вялікім ззянні Пана Езуса, які наблізіўся да мяне і прамовіў: ***Супакой вам, дзеці Мае,*** — узняў руку і благаславіў. Раны на руках, на нагах і ў боку былі незацягнутыя, але яны ззялі. Калі Ён зірнуў на мяне з такою ласкаю і любоўю, што ўся мая душа патанула ў Ім, Ён мне сказаў: ***Ты прыняла вялікі ўдзел у Маёй муцы, таму Я даю табе гэты вялікі ўдзел у Маёй хвале і ў радасці***» («Дзённік», 205).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, што ігнаруюць святыя сакрамэнты, не выкарыстоўваюць ласкі, здабытыя Хрыстом для чалавецтва праз Яго ўваскрасенне.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

Паўтараем пасля кожнай таямніцы:

*Няхай будзе праслаўлёны Найсвяцейшы Сакрамэнт, праўдзівае Цела і Кроў Пана нашага Езуса Хрыста.*

*О мой Езу, прабач нам грахі нашыя, захавай нас ад агню пякельнага, правядзі ўсе душы на неба і дапамажы асабліва тым, каму найбольш патрэбна Твая міласэрнасць.*

*О Марыя, без граху першароднага зачатая, маліся за нас, хто ў Цябе паратунку шукае, і за тых грэшных, хто Табою пагарджае, асабліва за ворагаў Касцёла і даручаных Табе.*

*Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі.*

## II. Унебаўшэсце Хрыста

«Пасля размовы з імі Пан Езус узнёсся ў неба і сеў праваруч Бога. А яны пайшлі і паўсюль прапаведавалі. Пан садзейнічаў ім і пацвярджаў слова знакамі, што яму спадарожнічалі» (Мк 16, 19–20).

«Сёння я суправаджала Пана Езуса, калі Ён узыходзіў на неба. <...> У гэты час я ўбачыла сябе сярод вялікага мноства вучняў, побач з апосталамі і Маці Божаю; Езус казаў, каб ішлі на ўвесь свет, *навучаючы ў Імя Маё*. Ён выцягнуў руку, паблагаславіў іх і знік у воблаку. Я бачыла тугу Найсвяцейшай Панны. Яе душа ўсёю сілаю любові засумавала па Езусу, але Яна была такая спакойная і адданая Богу, што ў Яе сэрцы не было аніякага іншага парыву, апрача пажаданага Богу» («Дзённік», 1710).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія жывуць толькі сённяшнім днём і не думаюць пра вечнасць, спрабуюць стварыць сабе шчасце і рай тут, на зямлі, робячы гэта заўсёды за кошт іншых людзей і ранячы Сэрца любячага Збавіцеля.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

## III. Спасланне Духа Святога

«Калі настаў дзень Пяцідзясятніцы, усе былі разам у тым самым месцы. Раптам узняўся шум з неба, нібы павеў моцнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе сядзелі яны. З'явіліся ім языкі падзеленыя, быццам ад агня, і затрымаліся на кожным з іх. Усе напоўніліся Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць» (Дз 2, 1–4).

«Я перажываю хвіліны з Найсвяцейшаю Маці. З вялікаю тугою чакаю прыйсця Пана. У мяне вялікія жаданні. Я хачу, каб усе народы спазналі Пана, прагну падрыхтаваць усе народы да прыйсця Уцелаўлёнага Слова. О Езу, учыні, каб крыніца Тваёй міласэрнасці выплыла з большаю шчодрасцю, бо чалавецтва вельмі схварэлае...» («Дзённік», 793).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія грашаць супраць Духа Святога, не прызнаючы Яго існавання і дзеяння. Няхай нашае наследаванне Марыі, якая просіць дароў Духа Святога і якая адданая Яго кіраўніцтву, будзе нашым перапрашэннем за грахі тых, хто кіруецца духам гэтага свету.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

## IV. Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі

«І цяпер благаслаўляць мяне будуць усе пакаленні. Бо вялікае ўчыніў мне Усемагутны...» (Лк 1, 48–49).

«Падчас разважання Божая прысутнасць жыва прасякнула мяне і я адчула радасць Найсвяцейшай Панны ў момант Яе ўнебаўзяцця… <...> Калі мы засталіся сам-насам з Найсвяцейшаю Паннаю, Яна навучала мяне духоўнаму жыццю. Яна казала мне: „Сапраўдная веліч душы ў тым, каб любіць Бога і прыніжаць сябе побач з Ім, цалкам забыць пра сябе і лічыць сябе мізэрнасцю, бо вялікі ёсць Пан, але толькі да пакорных Ён прыхільны, а ганарлівым заўсёды працівіцца“» («Дзённік», 1244, 1711).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія не прымаюць дагмату пра ўнебаўзяцце Марыі.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

## V. Укаранаванне Найсвяцейшай Панны Марыі

«Устаноўленая Панам Каралева неба і зямлі, узвышаная над усімі хорамі анёльскімі і іерархіяй святых, стоячы па правіцы свайго Адзінароднага Сына, Пана нашага Езуса Хрыста, Яна моцна заступаецца за нас сваімі мацярынскімі просьбамі, атрымліваючы тое, чаго прагне, і не можа быць падманутая» (Пій IX).

«З самай раніцы я адчувала блізкасць Найсвяцейшай Маці. У часе святой Імшы я ўбачыла Яе такою прыгожаю і цудоўнаю, што ў мяне няма словаў, каб я магла выказаць хоць бы частку гэтага хараства. Яна была ўся белая, падперазаная блакітнаю стужкаю, плашч — таксама блакітны, на галаве — карона; уся Яе постаць выпраменьвала дзіўнае святло. „Я — Валадарка неба і зямлі, але найперш — ваша Маці“» («Дзённік», 805).

«Марыя, Беззаганная Дзева, вазьмі мяне пад сваю асаблівую апеку і ахоўвай чысціню маёй душы, сэрца і цела. Ты — узор і зорка майго жыцця» («Дзённік», 874).

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія не прызнаюць каралеўскай годнасці Найсвяцейшай Маці і не аддаюць Ёй належнай пашаны.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя* чытаецца просьба: *Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.*